ТАМАРА БАРАДЗЁНАК

# З БАБУЛІНАГА КУФЭРКА



2016

2016




*Тамара Барадзёнак*

# Чым прыгожы чалавек?

(казка)

Жыла-была ў адной вёсцы дзяўчынка. Звалі яе Настачка. Прыгожая была Настачка: косы, нібы лён, вочы блакітныя, як неба, шчочкі румяныя, як яблычкі. Хто ні ўбачыць Настачку, той хваліць яе: “Якая дзяўчынка прыгожая! Само хараство!”

Заганарылася Настачка. Цэлымі днямі перад люстэркам круціцца, усё прыхарошваецца, сабою любуецца, а работу хатнюю не дапамагае маці рабіць.

Просіць аднойчы маці Настачку:

– Прынясі, дачушка, вады, буду ў печы паліць, страву гатаваць, аладак смачных напяку.

А Настачка, гледзячыся ў люстэрка, адказвае:

– Не пайду за вадой – баюся ў студню зваліцца.–

– Дык ты за зруб трымайся – і не звалішся. –

– Баюся ў пальцы стрэмак нагнаць, – не згаджаецца ісці па ваду Настачка.

– Рукавічкі надзень, каб рукі не пашкодзіць, – угаворвае маці.

– А рукавічкі мокрыя, я забылася іх высушыць, – стаіць на сваім Настачка, а сама ўсё перад люстэркам прытанцоўвае.

Пачула гэтую размову маці з дачкой праз адчыненае акно суседская дзяўчынка Кацечка, забегла ў хату і кажа:

– Цётачка Ганна, давайце вядзерца, я Вам вадзіцы са студні прынясу.

– Дала Настаччына маці Кацечцы вядзерца, прынесла тая вады са студні, запаліла гаспадыня ў печы, напякла смачных пульхных аладак.

Смачна запахла аладкамі ў хаце, як скідала іх маці з патэльні, пачула пах Настачка, падбегла да маці і просіць:

– Дай мне аладку, мама!

– Яны гарачыя, рукі апячэш ды папсуеш, – адказвае маці.

– Я рукавічкі надзену, каб не апячыся, – знайшлася Настачка.

– Рукавічкі мокрыя, ты іх не высушыла, – усміхнулася маці. – А гарачымі аладкамі і язык, і вусны апячы можна.

Так што не трэба табе прыгажосць сваю псаваць, аладкамі я лепш пачастую Кацечку, бо ў яе добрае і чулае сэрца, яна дбайная і працавітая дзяўчынка.

Надзьмула вусны Настачка, адышла ад маці, села ў куточку, задумалася, да люстэрка свайго не падыходзіць.

Пасядзела яна гэтак, падумала, потым падышла да маці, вінавата глянула на яе і ціха прамовіла:

– Я ўсё-ўсё зразумела, мамачка. Цяпер заўсёды і ва ўсім буду табе дапамагаць.

– Вось і добра, што ты ўсё зразумела сама, – лагодна ўсміхнулася Настачцы маці.– І памятай заўсёды, дачушка, што чалавека робіць прыгожым не толькі знешні выгляд, а яго ўменне рабіць добрыя карысныя справы.



# Хлусіць нельга!

(казка)

Жыў на свеце хлопчык. Звалі яго Данілка. Просіць аднойчы Данілку мама:

– Дапамажы мне, калі ласка, сынок! Палузай арэхі для пірага, пакуль я цеста мясіць буду.

– Дапамагу, але ты купі мне самалёцік, што сам лятаць умее. Сягоння ў краме бачыў. Майму сябру Арцёмку ўжо купілі такі, я таксама хачу.

– Ну добра, будзе табе самалёцік, лузай бяры арэшкі хутчэй!

Данік узяў з шафкі кулёчак з арэхамі, прынёс абцужкі, адзін арэх раструшчыў, другі, трэці – лушпінне ў смецце на старую газету, а ядро на талерку. А чацвёрты арэх такім буйным аказаўся, ядро жаўтлява-карычневае, апетытнае. Не ўтрымаўся Данік, укінуў смакату сабе ў рот. Асмакаваўся, і марачы пра тое, як заўтра будзе гуляць з новым самалёцікам, непрыкметна для сябе з’еў усе арэхі з кулька.

– Данік, гатовы арэхі? Давай сюды! – падышла маці да хлопчыка і, здзіўленая, усклікнула:

– А дзе ж арэхі? –

– Не было больш, мамачка! – не міргнуўшы вокам, схлусіў Данік, а сам лушпінне, загорнутае ў газету, далей пад стол падпіхнуў.

Нічога не сказала маці, адышла і стала рабіць пірог без арэхаў. А Данік, умомант забыўшы сваю хлусню, пабег на вуліцу да сяброў.

Назаўтра, калі хлопчык вярнуўся са школы, маці была дома, а на тумбачцы ў яго пакоі стаяла прыгожая каробка з намаляваным на ёй самалётам. Данік, падскочыўшы ад

радасці, падбег і схапіў у рукі каробку. Але што ж гэта яна занадта лёгкая? Адкрыўшы каробку, хлопчык убачыў, што яна пустая.

– А дзе ж самалёцік, мама? – усклікнуў разгублены Данік.

– А што, няма ў каробцы самалёта? – выціраючы ручнікам рукі, заглянула з кухні ў Данікаў пакой маці.– Ну дык, напэўна, не паклалі яго ў каробку, як на фабрыцы іх запакоўвалі. Што ж, бывае! – і маці закрыла дзверы ў пакой.

А Данік стаяў, трымаючы ў руках пустую каробку, і плакаў. Наплакаўшыся ад крыўды, заснуў на канапе.

Прачнуўся хлопчык, калі на вуліцы ўжо вечарэла. Устаў і пайшоў на кухню. Маці тупала там, гатавала вячэру. Убачыўшы Данілку, прамовіла ціха:

– Бачыш, сынок, як крыўдна, калі цябе падманваюць, хлусяць табе. А калі гэта робіць блізкі чалавек, гэта яшчэ больш балюча.

– Мамачка, я з’еў учора арэшкі. Іх больш было. Я ніколі больш не буду нікога падманваць, прабач мяне, калі ласка!

– Добра, сынок, я веру табе. А яшчэ хай заўсёды напамінае табе аб тым, што ты мне сёння паабяцаў, гэтая цацка. – І маці вачамі паказала на кухонную шафу, на якой без каробкі красаваўся яркі прыгожы самалёцік.



# Надзейны сябар

На двары ў бабулі жыў невялічкі сабачка Пірат. Куды б ні пайшла бабуля, Пірат заўсёды з ёю, заўсёды ўслед бяжыць. Зойдзе ў краму ці да суседкі – Пірат цярпліва на вуліцы чакае. Хату і падворак вартуе дзень і ноч, на чужых брэша – словам, сябар вельмі надзейны. Любіла бабуля свайго сабачку, карміла добра, заўсёды пагладзіць, палашчыць Пірата, у будцы яму саломы свежай насцеле – хай на мяккім ляжыць гарэзнік гэты.

А Пірат і сапраўды быў вялікім гарэзнікам. На падворку лепш ўсё сябраваў ён з каровай. Ды як! Падбяжыць ды лізне яе ў вільготную пысу. Карове, можа, і не вельмі падабалася такая яго пяшчота, яна фыркала, але глядзела паблажліва – маўляў, што з яго возьмеш, з гэтага блазнюка малога? Суседкі, калі заходзілі да бабулі, бачачы гэты дамашні цырк, ад душы смяяліся.

Аднойчы вечарам бабуля сустрэла карову з поля, падаіла, наліла, як заўсёды, сырадою ў місачку Пірату і пайшла ў хату працадзіць і спарадкаваць малако. Толькі праз некаторы час яна пачула спачатку гучны брэх Пірата, а потым сабачка пачаў драпаць дзверы ў сенцах, як рабіў ён заўсёды, калі хацеў, каб бабуля хутчэй выйшла з хаты.

– Ну чаго ты тут, Пірацік? – выйшаўшы на ганак, запытала бабуля. – Нікога ж, здаецца, няма.

А Пірат падбег да хлява, у якім ляжала на свежай падсцілцы карова, віскнуў, умольна гледзячы бабулі ў вочы, і чагосці чакаў. Бабуля, не разумеючы, што ён хоча, сышла з ганка і, спыніўшыся пасярод двара, аглядалася – дзе ж тут хто можа быць? Пірат, відаць, страціўшы ўсякую надзею на тое, што бабуля яго зразумее, у адчаі падбег да яе, ухапіў зубамі

за край фартуха і стаў цягнуць да хлява. Здзіўленая такімі паводзінамі свайго любімца бабуля падышла да адчыненых дзвярэй каровінага жытла, куды так настойліва вёў яе сабачка, і адразу ўбачыла прычыну яго страху і трывогі. На саломе недалёка ад каровы ляжаў, скруціўшыся, вялікі вуж.

Вуж – істота бяскрыўдная, карове шкоды не зробіць, але ж адкуль было ведаць пра гэта Пірату? Канешне, ён зблытаў вужа з гадзюкай, а баяцца гадзюк у Пірата была важкая прычына. Неяк летам, калі бабуля хадзіла з сабачкам па лесе, Пірат убачыў гадзюку і кінуўся на яе, а тая яго ўджаліла. Пірат сышоў некуды з дому, некалькі дзён яго не было, бабуля плакала, думала, што ўжо не вернецца, а ён вярнуўся. Слабы, схуднелы, з памутнелымі вачыма – ледзь жывы.

Дзякуючы добраму клапатліваму догляду бабулі, Пірат паправіўся, а вось страх перад гадзюкамі ў яго застаўся назаўсёды. Убачыўшы ў хляве вужа, прыняў яго за гадзюку і як мог, як умеў, ратаваў карову ад небяспекі.

Узяўшы пруток, бабуля прагнала няпрошанага госця з хлява. Супакоены Пірат з пачуццём выкананага абавязку палез у сваю будку.



# Кошка Мурка і кот Маркіз

Кошка Мурка ў бабулінай хаце пасялілася зусім нечакана. Ранняй вясной, калі яшчэ раніцай трымаўся добры марозік, унучка Наташа пачула жаласнае мяўканне. Каля брамкі яна ўбачыла невялічкае кацяня, якое трэслася ад холаду і крычала, просячы дапамогі. Дзяўчынка ўзяла яго на рукі і прынесла ў хату. Мяркуючы па тым, як прагна прыпала небарака да місачкі з малаком, блукала яна па холадзе не адзін дзень.

– Ці ж яно жыць будзе ў нас?.. – прамовіла бабуля, гладзячы кацяня, якое, пад'еўшы, заснула на дыванку ля парога. – Маркіз жа наш хіба гэта дапусціць?

Сапраўды, стары кот Маркіз, вялікі, чорны, што жыў у хаце ў бабулі ўжо доўгі час, меў нораў даволі круты. Сабакі свае і суседскія, ведаючы забіяку і ягоныя вострыя кіпцюры, чапаць таго не асмельваліся, не кажучы ўжо пра катоў. На сваёй дваровай тэрыторыі ён не выносіў іх прысутнасці.

Але як жа было выкінуць бедную малую прыблуду, якая і так нацярпелася і холаду, і голаду, і раўнадушша людзей.

Кот Маркіз з'явіўся ў хаце пад поўдзень. Як заўсёды, паважна зайшоўшы ў хату, накіраваўся да сваёй міскі з ежай, але раптам спыніўся ў здзіўленні і абурэнні, акругліў вочы, натапырыўся. З яго міскі ела кацяня, якога ён раней ніколі не бачыў. Адным скокам ён кінуўся да яго, але Мурка (так паспелі ўжо бабуля з унучкай назваць кошку) зусім не спалохалася, а ўтаропілася ў яго сваімі круглымі вочкамі і лагодна мяўкнула. Мусіць, на сваёй кашачай мове прывіталася. Бабуля з Наташай, гатовыя абараніць Мурку, доўга не маглі прыйсці ў сябе ад здзіўлення, убачыўшы, што

Маркіз не зачапіў новую жыхарку, а тая (і хітрая ж!..) адразу вызваліла яму як гаспадару месца ля міскі і той, пасядзеўшы хвілінку ў нерашучасці, пачаў есці.

Праз які тыдзень Мурка адчувала сябе гаспадыняю ў хаце. Яна лашчылася і да бабулі, і да Наташы, лазіла на печ, на двары даследавала кожны куток, паспела пасябраваць з сабачкамі, якія, дарэчы, мусіць, за ласкавы нораў не чапалі яе.

Мурка аказалася вельмі ахайнай кошкай. Яна так старанна вылізвала сваю мяккую доўгую поўстку, што тая здавалася прычасанай грабянцом. Больш таго, Маркіз, які ленаваўся ўмывацца, не супраціўляўся, калі Мурка, памыўшыся сама, пачынала прыводзіць у парадак і яго.

І дзіўна было бачыць, як Маркіз – той самы забіяка Маркіз, якога баяліся ўсе навакольныя каты і не рашаліся зачапіць сабакі, калі Мурка вылізвала сваім ружовым язычком поўсць у яго на галаве, задаволена жмурыў вочы.

А яшчэ праз некалькі дзён бабуля з Наташай сталі сведкамі цікавага выпадку. Яны прыбіралі каля хаты, калі цікаўная Мурка пайшла на суседскі двор паглядзець, што там ёсць і што робіцца. Суседская ж кошка Багіра, атрымаўшая мянушку за падабенства з пантэрай з вядомага мультфільма, з'яўленне новай суседкі ў сваім двары не пацярпела. Яна кінулася на Мурку, маючы намер пры дапамозе зубоў і кіпцюроў растлумачыць той, што заходзіць да яе ў двор не трэба. Мурка залямантавала ад страху і болю. Наташа хацела ўжо бегчы яе ратаваць, але са свайго двара чорнай маланкай рынуўся туды Маркіз. У імгненне вока пераляцеў ён цераз плот і так усчубіў Багіру, што тая, заенчыўшы, стрымглалоў кінулася наўцёкі. Але гэтым справа не скончылася. Лапаю

паддаў ён і Мурцы і пагнаў перад сабой яе назад, маўляў, не цягайся па чужых дварах, калі свой ёсць… Закончыўшы разборку, спакойна ўлёгся на нагрэтай веснавым сонейкам прызбе. А Мурка, залізаўшы драпіну, пакінутую Багірай, падышла і пачала прычэсваць язычком ускудлачаную поўсць на яго галаве.







# Юлечка

Наша Юлечка-красуня
Працаўніца, прыгажуня.
Любяць Юлю тата з мамай,
Любіць брацік Стась таксама,
Любяць баба, дзед бясконца –
Юля ўсім ім, нібы сонца.

Юля – рупная дзяўчынка:
Вяжа лялечцы касынку,
Палюляць кладзе ў каляску,
Забаўляе ляльку казкай.
І ўжо ўмее – не сакрэт –
Ляльчын маляваць партрэт.

Посуд лялечны расставіць,
Кашу смачную наварыць
І пакорміць ляльку кашай
Гаспадыня Юля наша.

Паспявае і паскача –
Ну артыстка ўжо, няйначай!
Хату чыста падмяце –
Во памочніца расце!

Запытала маці ў Вікі:

– Дзе змачыла чаравікі?

Брудная прыйшла дахаты –

– Гэта зайчык вінаваты! –

– Ох, і хлусіць! Не вы чулі? –

– Зайчык сонечны, мамуля!

Я злавіць яго хацела,

Вось і ў лужыну ўляцела.



***

– Што ты робіш, баба Нюша? –

Запытала ўнучка Ксюша.

– Я вяжу табе панчошкі,

Каб не мерзлі твае ножкі. –

– Буду я дапамагаць

– Нітачкі з клубкоў цягаць. –

Зблытаць ніткі ўсе змагла –

Гэтак Ксюша памагла



***

Маме Ліза так казала:
– Я ж табе дапамагала,
Бо як мыла ты падлогу,
Ля цябе была я доўга.
Як аладкі выпякала,
Побач я з табой стаяла.
А калі ты посуд мыла,
Я з табою гаварыла.
Я – памочніца твая,
Бо дзе ты, то там і я. –
Ой, хітрунне гэта Ліза!
Ну такая ўжо падліза!



***

– Што ж ты, Данік – бацька кажа –
Двойку ў сшытак атрымаў? –
– Я не змог рашыць задачу –
Верабей перашкаджаў.
Перад форткай ён дражніўся:
Чык-чырык ды чык-чырык.
Ні на хвілю не спыніўся,
Я ж да цішыні прывык.
І хаця ён гэтак славіць
Прыгажосць вясенніх дзён,
Двойку б вераб’ю паставіць,
Ды не мае сшыткаў ён.



***

Як так сталася, Валерка,
Што разбіў ты ўсе талеркі? –
- Маме я дапамагаў,
Посуд са стала сабраў,
І перш чым яго памыць,
Падкідаць стаў і лавіць.
Так разбіліся талеркі… –
Кепскі быў жанглёр з Валеркі!..